Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
– намеснік Міністра адукацыі
________________Р.С. Сідарэнка

«12» сакавіка 2019 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Магілёў, 2019 г.*

**11 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

## Варыянт I

**Заданне 1.** Сёлета споўнілася 100 гадоў з дня ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. На працягу першага дзесяцігоддзя існавання БССР яе ўрадам актыўна праводзілася палітыка беларусізацыі, вынікам якой стала ўвядзенне беларускай мовы ва ўсе найважнейшыя сферы грамадскага жыцця. Аднак менавіта ў гэты перыяд, дваццатыя гады XX стагоддзя, беларуская літаратурная мова ў шэрагу параметраў заўважна адрознівалася ад яе сучаснага нарматыўнага варыянта.

Для прыведзеных ніжэй слоў паспрабуйце аднавіць іх арфаграфічныя і фанетычныя асаблівасці ў адпаведнасці з тагачаснымі нормамі.

**Заўвага**: крытэрыем правільнасці адказаў з’яўляецца адпаведнасць напісанню слоў у наступнай крыніцы: *Некрашэвіч, С. Расійска-беларускі слоўнік / С. Некрашэвіч, М. Байкоў. – Менск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1928. – 721 с.*

*Максімальная колькасць балаў – **4** (**0,5 бала** – за кожны правільны адказ).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| антылопа | | арфаграфія | |
| мінерал | | святлец | |
| нейтральны | | меладрама | |
| сімвалічны | | бальніца | |

**Заданне 2.** Адной з задач у рэалізацыі палітыкі беларусізацыі ў дваццатыя гады XX стагоддзя была распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі. Адметнасцю гэтага працэсу было імкненне распрацоўшчыкаў ствараць новыя словы на ўласным моўным матэрыяле. Першыя спробы ў гэтай справе аказалі значны ўплыў на развіццё беларускай кніжнай лексікі: шмат якія словы, што з’явіліся ў той час дзякуючы моватворчай дзейнасці вучоных-філолагаў і спецыялістаў у іншых галінах навукі, такія, як, напрыклад, *выкапень*,

*выслоўе*, *дужкі*, *працягласць*, ужываюцца і сёння. Аднак нямала іх засталося толькі ў сваім часе.

Паспрабуйце “вылічыць” значэнні прыведзеных ніжэй слоў, што ўвайшлі ў тэрміналагічныя зборнікі дваццатых гадоў XX стагоддзя, але не замацаваліся ў мове, і запішыце іх сучасныя адпаведнікі.

**Заўвага**: словы запісаны ў адпаведнасці з сучаснымі правіламі арфаграфіі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | |
|---|---|
| паземнік (мат.) | |
| чужаед (мед.) | |
| вастраслуп (архіт.) | |
| міласпеў | |
| займенне (літаратуразн.) | |
| высмешлівы | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

У Дона стонущий рев. Ветер на клочья рвет косое полотнище дождя. Ощупывая ногами дно, Григорий по пояс окунулся в воду. Липкий холод дополз до груди, обручем стянул сердце. В лицо, в накрепко зажмуренные глаза, словно кнутом, стегает волна. Бредень надувается шаром, тянет вглубь. Обутые в шерстяные чулки ноги Григория скользят по песчаному дну. Глубже, глубже. Уступ. Срываются ноги. Течение порывисто несет к середине, всасывает *(По М. Шолохову)*.

**Заданне 4.** Запішыце прыведзеныя словы ў адпаведныя слупкі табліцы. Пры выкананні задання майце на ўвазе наступнае:

1) словы аналізуюцца ў прыведзенай граматычнай форме, 2) адно і тое ж слова можа ўваходзіць у розныя слупкі, 3) неабходна ўлічваць нулявыя марфемы, 4) падзельная аснова – аснова, якая дзеліцца на марфемы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Словы для аналізу**: багацце, выйшаў, геній, дзесьці, здароўе, кансультацый, меней, навек, паліто, радыус.

| Словы з нулявым канчаткам | Словы без канчатка | Словы з нулявым суфіксам | Словы з падзельнай асновай | Словы з непадзельнай асновай |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

**Заданне 5.** Выпішыце нумары прыкладаў з граматычнымі памылкамі. Запішыце выпраўленыя варыянты.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**1.** Паміж дзвюмастамі трыццаццю двума вучнямі. **2.** Два цэлых і тры дзясятых працэнта. **3.** З паўтары тысячамі рублямі. **4.** Пяццюстамі дваццаццю трыма дамамі. **5.** У паўтара талерках. **6.** Сорак чатыры новыя сталы. **7.** Дзве цэлыя і тры дзясятыя плошчы. **8.** Семдзесят трое сутак. **9.** Двухсот сарака дзвюх тон. **10.** Адзін цэлы і чатыры дзясятых літра.

**Нумары сказаў з памылкамі**: ______________________________.

**Выпраўленыя сказы**:

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

**Заданне 6.** Адны і тыя ж словазлучэнні часам даюць падставу для вызначэння розных відаў сінтаксічных сувязей і адносін.

Якія з прыназоўнікава-склонавых формаў у прыведзеных прыкладах у сказе будуць выкарыстаны ў ролі прыйменнага дапаўнення, а якія – недапасаванага азначэння?

Чым трэба кіравацца пры размежаванні гэтых членаў сказа?

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Словазлучэнні для аналізу**: дзяўчына ў модным паліто, павага да бацькоў, каша з аўсяных круп, назіранне за раслінамі, становішча з рамонтам, аповесць пра каханне, імкненне да стваральнай працы, патрабаванне да якасці.

| **У ролі прыйменнага дапаўнення** | **У ролі недапасаванага азначэння** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Тлумачэнне:**

________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________

**Заданне 7.** Не здзіўляйцеся, гэта не пераблытаны алфавіт, а зашыфраваныя прыказкі і прымаўкі, у якіх пакінулі толькі зычныя літары.

Аднавіце ўстойлівыя павучальныя выслоўі, што адлюстроўваюць назапашаны вопыт і мудрасць беларускага народа.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Узор**: ХЛБСМГЛВ: *Хлеб усяму галава.*

1. РЗМГРШМНЗМНШ – ______________________________.

2. КШМСЛМНСПСШ – ______________________________.

3. ЗДНГБТГДВХНБТХДЦЬ – ______________________________.

4. ПДЗЖЦССТРКЦЬПРЗМПРВДЗЦЬ – ______________________________
______________________________.

**Заданне 8**. Разгадайце крыжаванку.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



**Па гарызанталі:**

5. Драматургічны твор, у якім праз сатыру і гумар высмейваюцца заганы грамадства і чалавека. 7. Мастацкі напрамак, які склаўся ў еўрапейскай літаратуры XVII стагоддзя, у аснове – прызнанне антычнага мастацтва вышэйшым узорам, ідэалам, а твораў антычнасці – мастацкай нормай. У аснове эстэтыкі – прынцып рацыяналізму і культ розуму. 8. Літаратурны напрамак канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя, супрацьпаставіў сябе класіцызму як пошук больш адпаведных сучаснай рэчаіснасці форм яе адлюстравання. 9. Сутычка паміж персанажамі літаратурна-мастацкага твора або паміж персанажамі і асяроддзем, героем і абставінамі, супярэчнасці ўнутры свядомасці герояў.

**Па вертыкалі:**

1. Вялікі эпічны твор (празаічны або вершаваны), у якім адлюстравана гісторыя пэўнай асобы ў грамадскім асяроддзі, шырока ахоплены істотныя жыццёвыя з'явы. 2. Абмен рэплікамі, паведамленнямі дзвюх або больш асоб. 3. Сучаснае паэтычнае ўтварэнне, якое ўяўляе сабой свайго роду мяжу паміж вершам і прозай (у ім адсутнічае рыфма, памер, традыцыйная рытмічная ўпарадкаванасць; колькасць складоў у радку і радкоў у страфе можа быць рознай; таксама адсутнічае роўнасць акцэнтаў, уласцівая беламу вершу). 4. Трохскладовая стапа, у якой націск падае на другі склад. 5. Размяшчэнне, чаргаванне, суадносіны і ўзаемасувязь частак мастацкага твора, што служыць для найбольш поўнага ўвасаблення задумы мастака. 6. Трохскладовая стапа, у якой націск падае на першы склад.

**Заданне 9.** Пры дапамозе «паэтычнай» даведкі ўзнавіце ўрывак з верша па апошнім радку (радках). Запішыце назву і аўтара твора.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Радкі для даведкі:**

Гранаты кідалі ў бліндажы, / Расстанне – ў новае спатканне, / Не ён, а другія ішлі ў атаку, / І на вякі яно жыць застаецца, / Кожнай драбнічкай ты варта пашаны, / Калолі фрыцаў, палілі танкі / Чуецца гоман мне спелае нівы, / Кожнае слова вякамі створана. / Напеў жалейкі – ў труб гучанне, / Лесу высокага шум-гул шчаслівы, / Пяройдзе шлях у новы шлях, / Ціхая жальба палёў,

| | |
|---|---|
| **Урывак з верша** | |
| | |
| | |
| | *Выток жыцця – ў жыцця працяг.* |
| **Аўтар верша** | |
| **Назва верша** | |

| | | |
|---|---|---|
| **Урывак з верша** | | |
| | | |
| | | |
| | *І сцяг перамогі ўзнімалі ранкам* | |
| | *На заваёваным рубяжы.* | |
| **Аўтар верша** | | |
| **Назва верша** | | |

| | |
|---|---|
| **Урывак з верша** | |
| | |
| | |
| | *вечнае так, як народнае сэрца.* |
| **Аўтар верша** | |
| **Назва верша** | |

| | |
|---|---|
| **Урывак з верша** | |
| | |
| | |
| | *Песня магутных дубоў...* |
| **Аўтар верша** | |
| **Назва верша** | |

**Заданне 10.** Прачытайце ўрывак з водгука няўважлівага вучня. Знайдзіце фактычныя памылкі і выпраўце іх у табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Раман «Знак бяды» – адзін з самых глыбокіх у шэрагу ваенных твораў. У ім супрацьпастаўлены гераізм і здрадніцтва, людскасць і нялюдскасць, выкрыта двайная мараль. Пры гэтым празаік ацэньвае агульначалавечай мерaю і “сваіх”, і “чужых”, незалежна ад таго, заваёўнік перад ім ці тутэйшы. Быкаву важна засцерагчы чытача ад спрошчанага разумення гераізму і патрыятызму, таму ён уводзіць станоўчых персанажаў з варожага лагера (Карла) і адмоўных – з вяскоўцаў (Каландзёнак, Гуж, Лявон Багацька).

Пісьменнік падае гістарычныя падзеі праз успрыманне простымі людзьмі. Так, Сцепаніда, разважаючы пра нелюдзяў, якія прыйшлі у яе хату са зброяй, задаецца пытаннем, ці патрэбна зброя таму, на чыім баку праўда. Аўтар пераканальна паказвае, як ліхія часы беларусізацыі і вайны ўздзейнічаюць на характары вяскоўцаў: адных ламаюць, іншых гартуюць. Згадвае пісьменнік і “былых”, напрыклад, пана Жулегу, які трымаецца старасветчыны: “Цёнгле быў грэх кваліцца на чужое. На чужым і дармовым шчэнсця не бэндзе”.

Сімвалічным у творы з’уляецца вобраз крыжа на няўдобіцы, які ўвасабляе шчаслівы лёс персанажаў і, можна сказаць, цэлага пакалення. Галгофай стане гэтая зямля для Сцепаніды і Петрака. Гэта акурат і ёсць адзін з тых знакаў, які вынесены ў назву.

| Памылка | Правільна |
|---|---|
| 1. | 1. |
| 2. | 2. |
| 3. | 3. |
| 4. | 4. |
| 5. | 5. |